УДК 947.6 «1917»

М. Я. Сяменчык, дацэнт

# АБ НАПРАМКАХ АГІТАЦЫЙНА-ПРАПАГАНДЫСЦКАЙ РАБОТЫ БАЛЬШАВІКОЎ ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЦІ Ў 1918 Г.

The article dwells upon directions of Bolshevik agitation and propaganda activity in Western region in 1918.

Мяркуем, не варта аспрэчваць той факт, што ў гістарычнай навуцы савецкіх часоў тэма дзейнасці бальшавікоў з'яўлялася найбольш прыярытэтнай. У поўнай меры гэта адносілася і да вывучэння дзейнасці передавога атрада ленінцаў у асобе членаў РСДРП (б) Заходняга фронту і Паўночна-Заходняй арганізацыі РСДРП (б) беларускіх губерняў. Іх разнастайная (арганізацыйная, гаспадарчая, ваенная, ідэйна-прапагандысцкая, культурная і г. д.) дзейнасць у першыя гады Савецкай улады ўсебакова асветлена і замацавана ў айчыннай гістарыяграфіі, дзякуючы намаганням многіх партыйных гісторыкаў. Наколькі гэта было магчыма ва ўмовах кіравання КПСС, аўтары пакінулі выразнае ўяўленне аб падзеях 1917–1918 і больш позніх гадоў. Як паведамляў № 6 часопіса «Коммунист Белоруссии» за 1988 г., па розных прычынах назіралася «недастатковая распрацаванасць гістарычнай навукі ў адносінах яе тэорыі і метадаў, адыход ад прынцыпу навуковасці, праўдзівасці, ператварэнне скажэнняў падзей і фактаў гісторыі ў звычайную з'яву, уход ад вострых праблем і г. д.» [1, с. 9].

Нягледзячы на вялікія перамены, якія адбыліся ў жыцці нашага грамадства за апошнія 20 гадоў, многія творы азначаных аўтараў не згубілі сваёй навуковай вартасці, паколькі грунтаваліся на выкарыстанні значнай базы архіўных крыніц, успамінаў непасрэдных удзельнікаў усталявання Савецкай улады і ўтварэння беларускай дзяржаўнасці і г. д.

У наш час існуюць дастаткова спрыяльныя ўмовы для далейшага развіцця навукі, выкарыстання новых метадаў і крыніц, але, на жаль, істотнымі творамі наша гістарыяграфія не ўзбагацілася. Варта адзначыць, што гэта тэма не з'яўлялася аб'ектам спецыяльнага даследавання. Мала таго, змешчаны ў гістарычнай энцыклапедыі артыкул пра Заходнюю вобласць дае пра яе не толькі павярхоўную, але і скажоную інфармацыю. Тут, у прыватнасці, гаворыцца, быццам гэта «адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка 1917–1918 гг. утворана паводле пастановы Усерасійскай Нарады Саветаў (сакавік 1917 г.) на з'ездзе Саветаў Мінскай, Віленскай і Магілёўскай губерняў у чэрвені 1917 г. як часовае аб'яднанне губерняў з мэтай цэнтралізаваць кіраўніцтва мясцовымі Саветамі. Цэнтр вобласці – г. Мінск» [2, с. 425]. Варта заўважыць, што такая «адзінка» ў тагачасных дзяржаўных дакументах Расійскай імперыі (рэспублікі) не адлюстравана. І далей, быццам «пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. Заходняя вобласць стала адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкай у складзе Віленскай, Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў». На справе Магілёўская і Віцебская губерні Аблвыкамзаху не падпарадкоўваліся, а мелі ўласныя органы ўлады.

Падобныя недакладнасці асабліва нецярпімыя зараз, калі статус суверэннай Рэспублікі Беларусь надзвычай актуалізуе патрэбу ў даследаванні гісторыі яе дзяржаўнасці ад складвання перадумоў да практычнага афармлення.

Як вядома, у выніку адноўленага 16 лютага 1918 г. кайзераўскімі войскамі наступлення больш за $^4/_5$ часткі Беларусі была акупіравана. Кіраўніцтва Аблвыкамзаха і Паўночна-Заходняга камітэта РСДРП (б) эвакуіравалася ў Смаленск, які і стаў палітычным і адміністрацыйным цэнтрам новай тэрытарыяльнай адзінкі РСФСР – Заходняй вобласці (пазней Камуны). За час свайго знаходжання на Беларусі і на Заходнім фронце мінскія бальшавікі выявілі свае лепшыя ідэйныя і арганізатарскія якасці. Намаганнямі А. Ф. Мяснікова і В. Г. Кнорына выходзілі і запаўняліся адпаведнымі матэрыяламі газеты «Звезда», «Бюллетень ВРК Западного фронта» і «Советская правда». Невыпадкова ЦК РКП (б) і ленінскі СНК даверылі мінскім бальшавікам кіраўніцтва Заходняй вобласцю. Афіцыйнае яе афармленне адбылося 10–14 красавіка 1918 г. на II з'езде Саветаў рабочых і сялянскіх дэпутатаў 27 паветаў Смаленскай і неакупаваных рэштак Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губерняў [3].

15 красавіка было ўтворана яе кіраўніцтва, да якога перайшлі функцыі СНК, – так званы Аблвыкамзах (АК) у складзе А. Ф. Мяснікова (старшыня да лістапада 1918 г.), М. І. Калмановіча (у лістападзе – снежні), Собалева (тав. старшыні) [4], С. В. Іванова (тав. старшыні), І. І. Рэйнгольда (заг. аддзела працы, гандлю і прамысловасці), Л. П. Рэзаўскага (заг. аддзела

унутраных спраў), Самавера (заг. аддзела фінансаў), В. Г. Кнорына (заг. аддзела мастацтваў), В. І. Яркіна (старшыня камісіі па барацьбе з контррэвалюцыяй), Р. П. Найдзёнкава (старшыня саўнаргаса). Усе абраныя з'яўляліся членамі Камуністычнай партыі [5, л. 118]. 3 мая ўсе функцыі былога Смаленскага губернскага выканкама перайшлі да АК [1, с. 254 ].

Друкаваным органам Аблвыкамзаха некаторы час была «Советская правда», затым «Известия Совета рабочих, красноармейских, крестьянских и батрацких депутатов Смоленской губернии» (пазней перайменаваная ў «Западную Коммуну»). Рэдакцыя газеты складалася з камуністаў [5, л. 304].

Такім чынам, па сутнасці, да ўлады прыйшлі тыя, хто рыхтаваў Кастрычніцкую рэвалюцыю на Заходнім фронце, у Мінску і прылеглых да яго мясцовасцях. Яны пачыналі працу з апорай на 5 тыс. камуністаў, а напярэдадні абвяшчэння БССР іх было ўжо каля 17 тыс. [6].

У склад Паўночна-Заходняга камітэта РКП (б) уваходзілі: А. Ф. Мяснікоў (старшыня), І. Я. Алібегаў (тав. старшыні) [7], пазней М. І. Калмановіч (тав. старшыні, ён жа скарбнік); сакратар І. І. Рэйнгольд, пазней В. Г. Кнорын [7], Р. В. Пікель, С. В. Іваноў, Собалеў, Я. Цыруль, С. Берсан (кандыдаты), В. І. Яркін і М. Ахманаў [15]. Партыйным органам Паўночна-Заходняга АК РКП (б) з'яўлялася газета «Звезда» (тыраж 10 тыс. экз.). З другой паловы верасня яе рэдкалегія занялася выданнем сялянскай газеты «Бедняк» (тыраж 8 тыс. экз.) [8].

Некаторы час Смаленскі, Віцебскі і Магілёўскі (Мсціслаўль) губернскія выканкамы і камітэты РКП (б) імкнуліся захаваць аўтаномію, але безвынікова: губерні былі ліквідаваны, а сепаратызм іх кіраўнікоў быў асуджаны [9, с. 25–26]. У гэтым кірунку Паўночна-Абласному камітэту РСДРП (б) давялося прыкласці шмат намаганняў.

Разам з тым супярэчнасці, якія існавалі паміж губернскімі і абласным партыйнымі кіраўніцтвамі, не перашкаджалі іх дзейнасці ў вырашэнні агульных задач, што паўсталі перад імі ў сувязі з узмацненнем грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыяй. Іх (задач) неадкладнасць, шматлікасць, разнастайнасць і г. д. абумовілі напрамкі, метады і спецыфіку агітацыйна-прапагандысцкай работы бальшавікоў як на тэрыторыі Заходняй вобласці, так і за яе межамі – у акупаваных немцамі паветах Беларусі.

Бальшавіцкія лідэры АК усімі сродкамі імкнуліся скарыстаць людскі і матэрыяльны патэнцыял вобласці агульнадзяржаўным патрэбам, найпершай з якіх з'яўлялася ўзброеная абарона РСФСР. Сапраўды, Брэсцкі мір даў перадышку толькі на Захадзе. Летам на ўсходзе краіны адбылося антысавецкае паўстанне чэхаславацкага корпуса, падтрыманае праціўнікамі бальшавікоў у Паволжжы. У гэтай сувязі дастаткова аператыўна ў мясцовай партыйна-савецкай прэсе з'явіліся перадрукоўкі з «Правды», накшталт, «Да зброі, рабочыя і сяляне!», «Хто і навошта вае з Савецкай уладай», «Чаму нам патрэбна ў першую галаву разбіць чэхаславакаў?» [10].

5 жніўня на пашыраным пасяджэнні членаў Аблвыкамзаха пад старшынствам М. І. Калмановіча з удзелам Смаленскага Савета, прафсаюзаў і ФЗК была прынята рэзалюцыя, прапанаваная фракцыяй камуністаў з заклікам усебакова дапамагаць Усходняму фронту [11, с. 103]. Адпаведная праца распачалася на месцах. «Калі рабочыя і вясковая бедната хочуць выратаваць сябе і свае сем'і ад мук голаду, – заклікалі віцебскія бальшавікі, – калі яны хочуць пазбавіць краіну ад жахаў нямецкага ўварвання, яны павінны напружыць усе свае сілы на разгром ворага! На Волгу, на Урал, у Сібір павінны масамі рушыць нашы рабочыя…» [12].

Вядома, што пад кантролем Абласнога камітэта РКП (б) працавалі Мінская, Магілёўская і Бабруйская падпольныя групы, таму і на акупаванай тэрыторыі таксама праводзілася агітацыя аб утварэнні атрадаў на дапамогу Савецкай Расіі [13]. З падобным заклікам звярнулася да беларускага насельніцтва I канферэнцыя Камуністычных арганізацый Літвы і Беларусі [14, с. 93–94]. «Нам патрэбна вылучыць са свайго асяроддзя сумленных і дысцыплінаваных людзей, – гаварылася ў адозве, – якія ведаюць ваенную справу, і паслаць у Расію, у Смаленск. Там яны пастрояцца ў чырвоныя сацыялістычныя роты і палкі і пойдуць на барацьбу з чэхаславакамі адстойваць заваёвы рабочых і сялян, адстойваць працоўную Расію ад усіх драпежных звяроў...» [15]. «Сяляне і рабочыя Беларусі павінны павялічыць кадры Савецкай Чырвонай Арміі. Распраўляйцеся бязлітасна з правакатарамі, якія вярбуюць вас у чэхаславацкую армію... Ведайце, што там, на берагах Волгі, вырашаецца лёс Беларусі. Чым хутчэй мы пераможам чэхаславакаў, тым хутчэй немцы ачысцяць акупаваную Беларусь» [16].

Вясной-летам асноўная энергія бальшавікоў у барацьбе за дыктатуру пралетарыяту і бяднейшага сялянства скіроўвалася супраць былых саратнікаў – левых эсэраў, якія выступілі супраць «пахабнага» Брэсцкага міру і камітэтаў беднаты. У Заходняй вобласці моцныя суполкі ПЛС-Р існавалі ў Веліжы, Гарадку, Горках, Мсціславе, Невелі, Оршы, Смаленску. У Сянно выканкам Савета складаўся з левых эсэраў і беспартыйных, а бальшавіцкая літаратура ў павеце не распаўсюджвалася [17]. Былі выпадкі, што незадаволеныя харчразвёрсткай левыя эсэры ад імя Савецкай улады загадвалі сялянам касіць хлеб пад выглядам таго, што

існавала пагроза яго захопу немцамі. «Прызнаючы пасылку харчова-рэквізіцыйных атрадаў у вёску апошнім крокам рэвалюцыі, бо гэта прывядзе да грамадзянскай вайны і праліцця крыві, – гаварылася ў адной з рэзалюцый ад 14 ліпеня, – мы, члены прафсаюза рабочых і служачых гор. Сянно, адмаўляемся браць удзел у такім вырашэнні харчовага пытання» [5, л. 356].

Невыпадкова таму бальшавіцкае кіраўніцтва распачало актыўную ідэйную барацьбу супраць ПЛС-Р як «абаронцы» інтарэсаў працоўнага сялянства. «У левыя эсэры ідуць і сярэднія заможныя мужычкі і заможней за іх, і нават прама кулакі, – пісала «Звезда». – Слова «працоўнае» – шырокае слова і яно ўмяшчае самы разнашэрсны зброд. Аднаго толькі няма ў іх партыі – гэта бяднейшага сялянства, ісцінных вясковых пралетарыяў, ісціннай беднаты» [18].

У мэтах выкрыцця правакацыйных падкопаў левых эсэраў супраць харчразвёрсткі выступала абласная прэса, «але такого прыёму абвяшчэння насельніцтва зусім недастаткова, – прызнавалі бальшавіцкія агітатары, – а варта было б абвясціць валасныя і зямельныя камітэты асобымі лістоўкамі, бо газеты ў гарачую пару зусім у вёсцы не чытаюцца» [19].

Крытыка бальшавікамі ПЛС-Л і яе мясцовых арганізацый яшчэ больш узмацнілася пасля падзей 6 ліпеня, калі ў Маскве адбыліся забойства германскага пасла і спроба дзяржаўнага перавароту на чале з левымі эсэрамі. З гэтай нагоды Паўночна-Заходні АК РКП (б) разам з Аблвыкамзахам прыняў шэраг захадаў супраць адпраўкі мясцовымі эсэрамі атрадаў на дапамогу сваім таварышам, здзейсніў арышты асобных іх актывістаў [20], [21], а таксама разгарнуў у сваім друку кампанію ў падтрымку Савецкай улады. Варта адзначыць, што 9 ліпеня Паўночна-Заходні АК ПЛС-Р асудзіў уласны ЦК і выказаўся за абарону Савецкай улады і звярнуўся да сваіх таварышаў з адпаведнай адозвай [22]. Гэтая акалічнасць, у прыватнасці, дазволіла мясцовым бальшавікам арганізаваць і правесці ў адпаведным рэчышчы павятовыя з'езды ў Веліжы, Гарадку, Мсціслаўлі, Невелі, Оршы, Полацку і іншых гарадах [23], [24], [25, л. 9 зв.], [26], вынікам якіх стала ўмацаванне бальшавіцкай прысутнасці ў выканкамах і асуджэнне левых эсэраў Масквы як контррэвалюцыянераў.

Гэтая праца набыла новы імпульс, калі, паводле бальшавіцкай газеты, «6 жніўня ў Оршы адбылося паўстанне хуліганскіх і рабаўніцкіх банд пры ўдзеле некаторых часцей мясцовага гарнізона, якія разлажыліся і не жадалі ісці на чэхаславацкі фронт» [27]. З гэтай нагоды ПЛСР у асвятленні бальшавіцкіх агітатараў губляла былыя рэвалюцыйныя якасці. «Аб гэтым яскрава сведчаць паведамленні пра Аршанскія падзеі 6–7 жніўня, дзе мяцеж праходзіў яўна пад чарнасотніцкімі і пагромнымі лозунгамі. Гэта патрэбна купцам, гэта патрэбна спекулянтам, гэта патрэбна англа-французам. Ім дапамагаюць рамантыкі рэвалюцыі, якія на справе ператвараюцца ў яе здраднікаў, левыя эсэры» [28].

Як правіла, у падмацаванне падобных артыкулаў змяшчалася інфармацыя аб пакаранні «ворагаў рэвалюцыі». «Расстрэл нягоднікаў» [29] і рэзалюцыі народных сходаў у падтрымку Савецкай улады [30]. У гэтым жа рэчышчы і ў тых жа мэтах змяшчаліся паведамленні аб спробе левых эсэраў справакаваць наступленне германскіх войск («Подзвіг сенненскіх левых эсэраў») [20]; аб «засіллі кулакоў у Полацкім павеце» і леваэсэраўскай агітацыі [31].

У сваёй далейшай дзейнасці бальшавіцкае кіраўніцтва Абласнога камітэта партыі, нягледзячы на запэўніванні левых эсэраў пра лаяльнае стаўленне да Савецкай улады, не адмовіліся ад іх вострай крытыкі і скіроўвалі намаганні да іх поўнай дыскрэдытацыі ў вачах працоўных, на ўмацаванне аўтарытэту камуністаў як адзінай рэальнай сілы. «Будзьце асцярожныя да тых, – гаварылася ў адной з ліпеньскіх адозваў, – хто пераходзіць з Партыі Левых Сацыялістаў-Рэвалюцыянераў і іншых у нашу партыю, бо з іх вельмі мала шчыра адданых сялянскай працы і яны ідуць зараз у нашу партыю для яе разлажэння» [32].

Варта адзначыць, што ў галіне ідэйнай барацьбы супраць іншых партый, якія стаялі на глебе Савецкай улады, бальшавіцкія лідэры Заходняй вобласці выяўлялі сябе як непахісныя абаронцы прынцыпу дыктатуры пралетарыяту і бяднейшага сялянства. У гэтым кантэксце спробы Беларускіх секцый РКП (б) і Белнацкама актуалізаваць пытанне аб утварэнні Беларускай савецкай рэспублікі не знаходзілі іх падтрымкі, а наадварот, падвяргаліся безумоўнай абструкцыі і дыскрэдыдацыі (В. Г. Кнорын «Ці патрэбны нам нацыянальныя камісарыяты?», «Яшчэ раз аб савецкіх сацыял-шавіністах» [33],[34] і інш. І калі ў такога кшталту бальшавіцкіх матэрыялах былі пэўныя элементы ўзважанай крытыкі, то ў характарыстыцы грамадскіх дзеячоў і іх органаў друку, якія засталіся на акупаванай немцамі тэрыторыі, тым больш – лідэраў БНР, работнікі партыйна-савецкіх газет у пошуку аргументаў патрэбы не адчувалі. Таму, у прыватнасці, прысвячаліся адмысловыя агляды «замежнай» прэсы: «Нямецкія газеты на рускай мове» [35], «Мінская газетная брыдота на рускай мове», «Літаратурныя байструкі акупаваных абласцей» [36], «Наёмныя пісакі ў ролі публіцыстаў» [37].

З'яўленне падобных твораў дыктавалася ў асноўным патрэбай вядзення барацьбы супраць ідэй, варожых бальшавізму; стварэння станоўчай грамадскай думкі аб Савецкай уладзе і неабходнасці ёй усебакова дапамагаць

і г. д. [38]. Гэтая неабходнасць, у сваю чаргу, узмацнялася па меры набліжэння перспектывы вызвалення Беларусі ад германскіх акупантаў. На ўмацаванне партыйнай лініі скіроўвалася выступленне «Звезды» з атыкулам «Супраць кааліцый»: «Як у нас, у Расіі, так і пад пятой заваёўнікаў, камуністы абавязаны ісці сваёй уласнай, прамой і бескампраміснай дарогай; ніякіх перагавораў і пагадненняў з групамі, якія называюць сябе сацыялістамі; непрымірымая барацьба як з буржуазіяй, так і з прыліплымі да яе малюскамі – нікчэмнымі спадарожнікамі вялікай сацыяльнай барацьбы класаў» [39].

Дадатковы да Брэсцкага дагавор паміж Расіяй і Германіяй ад 27 жніўня аб паступовым вызваленні кайзераўскімі войскамі акупаваных тэрыторый РСФСР надаў новы імпульс бальшавіцкай ідэйна-прапагандысцкай рабоце. Так, 12–13 верасня адбыўся III з’езд Саветаў Заходняй вобласці, удзельнікі якога нацэльваліся на аднаўленне Савецкай улады [40]. У прыватнасці, ставілася на мэце шырокая агітацыя сярод працоўных акупаваных раёнаў на прадухіленне вывазу немцамі матэрыяльных каштоўнасцей.

Асаблівы клопат выклікала праблема аховы ўраджаю ад германскіх рэквізіцый. З гэтай нагоды бальшавікі-падпольшчыкі ў сваіх адозвах заклікалі сялян не прадаваць хлеба і жывёлы [41]. Нават «Звезда» ў адкрытую заклікала не даваць «ні зярна нямецкім разбойнікам» [42]. Яна ж змяшчала звесткі аб сялянскіх паўстаннях у зоне германскай акупацыі. Як вынікала з нататкі «Паўстанцкі рух у Беларусі», быццам у Рэчыцкім, Мазырскім, Слуцкім паветах з’явіліся сялянскія атрады, узброеныя вінтоўкамі і рыдлёўкамі. «Яны знішчаюць дробныя германскія атрады. На днях сялянамі Рэчыцы знішчаны буйны германскі атрад, які займаўся рэквізіцыямі» [43]. Можна меркаваць, што гэтыя матэрыялы ў адпаведных мэтах былі разлічаны і на сялян акупаваных раёнаў.

У прэсе з’явіліся шматлікія рэзалюцыі насельніцтва, якое пражывала ў акупацыі і з нецярплівасцю чакала прыходу Савецкай улады. Як заяўлялі жыхары Сланеўшчынскага сельскага таварыства ў газету «Бедняк»: «Чакаем бальшавікоў з нецярплівасцю і працягваем сваю пралетарскую руку з дна пекла, у якім мы зараз знаходзімся пад уладай германскіх разбойнікаў». Паводле паведамлення Лепельскага Ваенсавета, сяляне Барысаўскага пав., Бярэзінскай вол. пыталіся, маўляў, «калі ж канец нашым мучэнням, калі ж нарэшце мы вызвалімся ад прыгнёту буржуазіі і яе памагатых» [44]. Неўзабаве падобныя нататкі змяніліся іншымі – аб святкаваннях насельніцтва з нагоды аднаўлення Савецкай улады [45].

Жыхароў заклікалі выкараняць спробы контррэвалюцыі захапіць уладу: «...зарання складаць спісы на мясцовых контррэвалюцыянераў, каб у момант ачышчэння паветаў усе белагвардзейцы былі на ўліку. У іх радах знаходзяцца і да іх прыпісваюцца былыя афіцэры, польскія легіянеры (якіх там дастаткова), прыхільнікі так званай Беларускай Рады, чыноўнікі, царскія паліцэйскія і стражнікі, заможная інтэлігенцыя, буржуазія і вясковыя кулакі» [46].

14 лістапада АК накіраваў «усе свае агітацыйныя сілы... на прыфрантавую паласу для абслугоўвання мясцовасцей, якія вызваляліся з-пад акупацыі», а таксама «вялікую колькасць літаратуры», шэраг агітатараў у Мінск, Бабруйск, Барысаў, Дрысу і інш. [47].

Усё ж, нягледзячы на велізарную падрыхтоўчую працу, праведзеную бальшавікамі ў напрамку фармавання грамадскай думкі на падтрымку Савецкай улады, практычныя мерапрыемствы яе органаў (мабілізацыі ў Чырвоную Армію, надзвычайны 10-мільярдны падатак) у лістападзе 1918 г. выклікалі ўзброенае супраціўленне насельніцтва асобных паветаў Смаленскай і Віцебскай губерняў. У выніку бальшавіцкае кіраўніцтва кваліфікавала яго як «кулацкія паўстанні» і ажыццявіла шэраг, у тым ліку прапагандысцкіх, мерапрыемстваў. У прыватнасці, у абгрунтаванне распачатых рэпрэсій з выкарыстаннем растрэлаў праводзілася думка аб з’яўленні ў Заходняй Камуне «арганізаванай змовы супраць Савецкай улады ва Усерасійскім маштабе», з удзелам выключна кулакоў, афіцэраў і інш. Сапраўды, у ліку «мяцежнікаў» называліся «кулакі», «міраеды», белагвардзейцы, кааператары, гандляры, але ніяк не сяляне [48], [49]. Як вынікала з матэрыялаў следчай камісіі, надрукаваных у прэсе, адной з прычын паўстання называлася «недастатковая вусная і друкаваная прапаганда» [50].

Такім чынам, з аднаўленнем Савецкай улады бальшавікі выявілі нязменнасць і паслядоўнасць у ажыццяўленні сваёй палітыкі, бескампраміснасць у дачыненні класавых праціўнікаў, адданасць гвалтоўным метадам у дасягненні пастаўленых мэт. Невыпадкова А. Ф. Мяснікоў у артыкуле «Без уступак» так заявіў пра нязменнасць прынцыпаў Савецкай улады: «...яна застаецца старой: поўнае і непадзельнае панаванне партыі камуністаў, нязменная і безумоўная савецкая ўлада з усімі сваімі атрыбутамі: надзвычайкамі, дыктатарскімі харчорганамі, ваенкамамі і г. д.» [51]. Як вынікае з азначанага вышэй, агітацыйна-прапагандысцкая работа, хоць і не называлася ў пераліку «атрыбутаў» Савецкай улады, але, бясспрэчна, ставілася на адно з першых месцаў. Не ўсім яе напрамкам надавалася належная ўвага (у часе, аб’ёме, мэтах), але на ўсім працягу 1918 г. дамінавалі ідэі непераадольнай сілы Савецкай улады ў яе імкненні забяспечыць дыктатуру пралетарыяту і бяднейшага сялянства, поўнай адпаведнасці

палітыкі партыі бальшавікоў інтарэсам працоўных, заганнасці спроб контррэвалюцыі (у тым ліку былых саратнікаў) вярнуць мінулае і г. д.

## Літаратура


1. Страницы истории Компартии Белоруссии: суждения, аргументы, факты / Сост. Ю. П. Смирнов, Н. С. Сташкевич; Под ред. Р. П. Платонова. – Мн.: Университетское, 1990. – 446 с.
2. Заходняя вобласць // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 1996. – Т. III. – С. 425–426.
3. Звезда. – 1918, 31 декабря.
4. Бедняк. – 1918, 19 ноября.
5. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 393. Воп. 4. Спр. 112. Л. 118.
6. Звезда. – 1918, 11 сентября.
7. Звезда. – 1918, 13 апреля.
8. Звезда. – 1918, 17 октября.
9. Куніцкая З. А. Унутрыпалітычны крызіс улады ў Заходняй вобласці (1918) // Веснік БДУ. Сер. 3. – 2005. - № 3. – С. 25–26.
10. Известия Советов Оршанского уезда. – 1918, 25 июля.
11. Переписка Секретариата ЦК РКП (б) с местными партийными организациями (август – октябрь 1918). – М.: Изд-во полит. литературы, 1969.
12. Известия Витебского губернского Совета. – 1918, 11 августа.
13. Звезда. – 1918, 3 сентября.
14. КП(б)Б у рэзалюцыях. – Ч. 1. (1903–1921). – Мн.: Парт. выд-ва, 1934.
15. Фонды Музея истории Великой Отечественной войны. Инв. № 19131.
16. Фонды Музея истории Великой Отечественной войны. Инв. № 19132.
17. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 393. Воп 2. Спр. 55. Л. 356.
18. Звезда. – 1918, 26 июня.
19. Звезда. – 1918, 4 июля.
20. Известия Смоленского Совета. – 1918, 18 июля.
21. Звезда. – 1918, 24 июля.
22. Известия Витебского Совета. – 1918, 13 июля.
23. Известия Совета Оршанского уезда. – 1918, 17 августа.
24. Звезда. – 1918, 24 июля.
25. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 393. Воп. 3. Спр. 60. Л. 9 зв.
26. Молот. – 1918, 26 июля.
27. Известия Совета Оршанского уезда. – 1918, 14 августа.
28. Известия Исполнительного комитета Северо-Западной области. – 1918, 13 августа.
29. Известия Исполнительного комитета Северо-Западной области. – 1918, 30 августа.
30. Звезда. – 1918, 22 августа.
31. Звезда. – 1918, 31 августа.
32. Известия Витебского губернского Совета. – 1918, 13 июля.
33. Звезда. – 1918, 28 июня.
34. Звезда. – 1918, 6 октября.
35. Звезда. – 1918, 24 июля.
36. Звезда. – 1918, 10 октября.
37. Звезда. – 1918, 1 августа.
38. Звезда. – 1918, 22 июня.
39. Звезда. – 1918, 14 августа.
40. Звезда. – 1918, 14 сентября.
41. Фонды Музея истории Великой Отечественной войны. Инв. № 8761.
42. Звезда. – 1918, 11 сентября.
43. Звезда. – 1918, 12 сентября.
44. Звезда. – 1918, 11 октября.
45. Известия Витебского губернского Совета. – 1918, 10 декабря.
46. Звезда. – 1918, 11 сентября.
47. Звезда. – 1918, 15 декабря.
48. Звезда. – 1918, 21 ноября.
49. Западная Коммуна. – 1918, 8 декабря.
50. Звезда. – 1918, 15 декабря.
51. Бедняк. – 1918, 14 декабря.